# Раніца №1

ВЫДАНЬНЕ МАЛАДАЧАНСКАГА АДЗЬДЗЯЛЕНЬНЯ БНФ "АДРАДЖЭНЬНЕ".

ІНФАРМАЦЫЙНАЕ ПАВЕДАМЛЕНЬНЕ.

19.03.1989 г. на сходзе прадстаунIкоу групау падтрымкI БНФ "Адраджэньне", якI адбыуся у г.Маладэчна, было утворана Маладачанскае гарадское рэгIянальнае адзьдзяленьне Беларускага Народнага Фронту за перабудову "Адраджэньне" / МГРА БНФ /.

На сходзе прадстаунIкоу групау падтрымкI БНФ быу абмеркаваны праект статута МГРА БНФ I утворана Рада упаунаважаных, у якую увайшлI прадстаунIкI з кожнай групы.

ТакIм чынам, рух за перабудову I дэмакратыю у г.Маладэчна структурна аформIуся у Маладачанскае адзьдзяленьне БНФ.

Мы цалкам падтрымлIваем IдэI I мэты БНФ "Адраджэньне":

- зямлю - тым, хто яе апрацоувае!
- прадпрыемства - тым, хто на Iх працуе!
- улада - Саветам!

Мы за сапраудное народауладздзе, за прававую дзяржаву, за ленIнскI сацыялIзм, за якI нам яшчэ трэба змагацца з бюракратыяй;

- за ахову правоу чалавека, за сапрауды дэмакратычныя законы, якIя не супярэчаць Усеагульнай ДэкларацыI правоу чалавека;
- за чалавечыя умовы жыцьця для усIх, а не толькI для сьпецвыбраньнIкау / партыйна-дзяржаунай бюракратыI /;
- за сапраудны плюралIзм ва усIх сьферах нашага жыцьця I супраць манапольнага валоданьня Iнфармацыяй;
- за рэальны суверэнIтэт нашай БеларусI у саставе СССР.

СуверэнIтэт у ЛенIнскIм меркаваньнI, якI бачыу у Саюзе СавецкIх СацыялIстычных РэспублIк ваенна-дыпламатычны саюз суверэнных дзяржау / т.45, с.360-361 /. Мы за вяртаньне беларускаму народу яго мовы, якая знIшчалася дзесяцIгодзямI, яго гIсторыI, якую ад яго хавалI I працягваюць хаваць.

Нам патрэбна экалагIчна чыстая Беларусь.

Хто-небудзь з чытачоу можа зауважыць нам, што I нашы беларускIя улады да гэтага ж Iмкнуцца. Мы адкажам аднасэнсова - НЕ! Iх справы, Iх дзейнасць гаворацъ аб Iншым.

Мы памятаем 30 кастрычнIка, калI мIрных людзей разганялI дубIнкамI, атручвалI газам.

Мы ведаем, як праходзIлI у нас на БеларусI выбары у народныя дэпутаты СССР, калI бюракратыя выкарыстоувала любыя магчымасьцI, каб правесьцI сваIх кандыдатау у дэпутаты. I той факт, што на БеларусI было I9 аднамандатных акругоу нам шмат аб чым гаворыць.

Мы бачым, як у нас лёгка улады робяць цI мяняюць законы на сваю карысьць. Законы, якIя супярэчаць КанстытуцыI СССР, КанстытуцыI БССР, Усеагульнай ДэкларацыI правоу чалавека.

Пакуль такIя зьявы маюць месца у нашым жыцьцI; пакуль усIХ, хто мае свае думкI на наша жыцьцё, якIя адрозьнIваюцца ад афIцыйных, наша рэспублIканская прэса аблIвае брудам, не прадстауляючы магчымасьцI друкаваць свае матэрыялы нават цэлым грамадскIм рухам; пакуль сёньняшнIя улады з лёгкI м сэрцам карыстаюцца сьпецразмеркавальнIкамI, сьпецлячэбнIцамI, сьпецсаугасамI, у той час, калI для простага народа прылаукI магазIнау пустыя, бальнIцы перапоунены, не хапае дзIцячых садкоу; пакуль яны усё вырашаюць за нас I душаць усё, што не дае Iм спакойна дасIджваць у сваIх крэслах I кIраваць намI; пакуль яны гавораць адно, а робяць Iншае / шмат чаму ёсьць прыкладай у Маладэчна / - дагэтуль мы ня будзем мець даверу да Iх.

Мы зьвяртаемся да усIх, хто чытае гэтыя радкI!

Мноства задач, якIя паусталI перад намI павIнен вырашаць сам народ цI яго прадстаунIкI пры дзейным народным кантролe. Пакуль гэтага няма. Але мы верым, што калI-небудзь народ стане сапраудным гаспадаром свайго жыцьця. Ня "добры цар", ня "добры барын", а мы з вамI, увесь народ павIнен ра бIць дэмакратыю, будаваць прававую дзяржаву.

КалI вы згодны з гэтым - тады далучайцеся да дэмакратычнага руху за перабудову, да барацьбы супраць бюракратыI, за прававую дзяржаву!

---

Рада Маладачанскага адзьдзяленьня БНФ "Адраджэньне"

Modern History Archives
Archiŭ Najnoŭšaj Historyi
F 1/11 ... sprava 9.22